Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

26 ЛЮТАГА 2008 г. АЎТОРАК
№ 37 (26150)
Кошт 430 рублёў
ВЫДАЕЦЦА 3 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

## Сітуацыя ў банкаўскай і фінансавай сістэмах Беларусі стабільная

**У Беларусі сітуацыя ў банкаўскай і фінансавай сістэмах стабільная, курс нацыянальнай валюты ўмацоўваецца, усе паказчыкі, закладзеныя ў Асноўных напрамках грашова-крэдытнай палітыкі Рэспублікі Беларусь на 2008 год, поўнасцю выконваюцца. Аб гэтым далажыў Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку старшыня праўлення Нацыянальнага банка Пётр Пракаповіч.**

Аляксандр Лукашэнка праінфармаваны аб тым, што з пачатку года афіцыйны курс беларускага рубля да долара ЗША ўмацаваўся на Br3. Такая станоўчая тэндэнцыя адзначаецца на працягу апошніх трох гадоў. Гэтаму садзейнічае добрая работа эканомікі Беларусі: валютная выручка беларускіх прадпрыемстваў у студзені гэтага года ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага павялічылася ў 1,6 раза, або больш як на $900 млн.

Стабільнасць беларускага рубля забяспечана адпаведнымі золатавалютнымі рэзервамі. Калі да пачатку 2008 года золатавалютныя рэзервы ў нацыянальным вызначэнні складалі $4993 млн, то цяпер яны набліжаюцца да $5200 млн. Патрэбнасць эканомікі Беларусі ў крэдытаванні забяспечваецца ў поўным аб'ёме, надзейна працуе плацежная сістэма, павялічваецца рэсурсная база банкаў. Кіраўнік Нацбанка паведаміў, што ў гэтым годзе чакаецца прыход некалькіх новых замежных інвестараў у банкаўскую сістэму Беларусі. Вядуцца перагаворы з банкамі Германіі, Польшчы, Італіі, Францыі і іншых краін.

Аляксандру Лукашэнку далажана аб выкананні яго асобных даручэнняў, што датычацца работы сельскагаспадарчых арганізацый, замацаваных за Нацыянальным банкам. Іх прыбытак за апошнія 2 гады павялічыўся больш як у 4,5 раза. На сустрэчы размова таксама ішла аб развіцці вяслярных відаў спорту ў краіне, аб выкананні іншых даручэнняў кіраўніка дзяржавы.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Унікальная шахматная фігура вернута дзяржаве

**Паводле інфармацыі прэс-службы УКДБ па Гродзенскай вобласці, у выніку аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў дзяржаве вернуты ўнікальны музейны экспанат — шахматная фігура ладдзі, якая ў жніўні 2004 года была скрадзеная з Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея.**

Пры спробе яе збыту супрацоўнікі дзяржбяспекі затрымалі 21-гадовага жыхара горада над Нёманам. Рэліквія часоў Кіеўскай Русі (XII ст.), якая доўгія гады лічылася сімвалам Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея, упрыгожваючы шматлікія экспазіцыі старажытнасці і буклеты, была ацэнена ім у два мільёны беларускіх рублёў. Матэрыялы затрымання перададзены ў Ленінскі РАУС г. Гродна для правядзення далейшых следчых дзеянняў.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## НАШЫ САМБІСТЫ ПАЦВЕРДЗІЛІ СВАЮ ПЕРАВАГУ

У мінулыя выхадныя ў сталічным Палацы спорту прайшоў XII Адкрыты чэмпіянат Беларусі па самба на прызы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. З гэтага сезона ён упершыню ўключаны ў міжнародны каляндар як адзін з чатырох этапаў Кубка свету, паведаміў старшыня Беларускай федэрацыі самба Уладзімір Япрынцаў. У турніры ўзялі ўдзел каля 200 удзельнікаў з 22 краін. Арганізатарамі турніру выступілі Міністэрства спорту і турызму, Нацыянальны алімпійскі камітэт, Рэспубліканскае дзяржаўна-грамадскае аб'яднанне «Прэзідэнцкі спартыўны клуб», Мінгарвыканкам, Беларуская федэрацыя самба, БФСА «Дынама». Беларускія спартсмены перамаглі ў 6 з 9 вагавых катэгорый, тым самым пацвердзіўшы, што наша каманда правамерна адносіцца да лідараў сусветнага самба. Уладальнікамі залатых медалёў сталі Андрэй Курлыпа (вагавая катэгорыя да 52 кг), Антон Машковіч (57 кг), Ігар Сядой (62 кг), Дзмітрый Базылеў (68 кг), Аляксей Сцеланькоў (82 кг), Яўген Сёмачкін (90 кг) (усе — Беларусь), Іван Яфанаў (74 кг), Вячаслаў Дзянісаў (100 кг) (абодва — Украіна), Андрэй Волкаў (звыш 100 кг) (Расія).

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

## ЁСЦЬ РЭКОРД!

У Беларусі ў мінулым годзе, паводле папярэдніх даных, з'явілася на свет 965 двайнят, 20 трайнят і 1 чацвярня («квартэт» малышоў з'явіўся ў Мінску). Гэта абсалютны рэкорд за апошнія два дзесяцігоддзі.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**У вёсцы Альшаны Столінскага раёна большасць насельніцтва занята ў прыватным сельскагаспадарчым сектары. Тут навучыліся вырошчваць розныя гатункі капусты і атрымліваюць добрыя ўраджаі.**

## Альшанскія запасы

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### ЛЮТАЎСКАЯ НАВАЛЬНІЦА

●На Гомельшчыне ў мінулыя выхадныя ў шасці раёнах без электразабеспячэння засталіся 29 населеных пунктаў, 13 будынкаў сельскагаспадарчага прызначэння, 10 жывёлагадоўчых фермаў, парушана работа 82 падстанцый. Вецер сарваў 122 квадратныя метры рубероїду з даху школы ў вёсцы Левашы Рэчыцкага раёна і 20 лістоў шыферу з МТФ вёскі Белая, што на Мазыршчыне. У адной з вёсак Лельчыцкага раёна на зямлі апынуліся два цагляныя франтоны плошчай у 20 квадратных метраў прыватнага дома. Вынікі стыхіі ліквідаваныя ў адных месцах цалкам, у іншых — часткова.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

●Моцны вецер стаў прычынай адключэння электрычнасці ў 265 населеных пунктах Беларусі.

●Падчас расчысткі дарогі загінуў старшына ўнутранай службы Чэрвеньскага раённага ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях. Вадзіцель аўтамабіля наехаў на супрацоўніка МНС, які распілоўваў паваленыя дрэвы на трасе.

●Супрацоўнікі МНС выратавалі двух рыбакоў, якіх панесла на адарванай крызе на адным з азёраў у Ганцавіцкім раёне.

●Раніцай 23 лютага над Лунінеччынай пранёсся буран. Моцным ветрам месцамі былі пашкоджаны дахі пабудоў, абясточаны лініі электраперадач. Дождж, а месцамі і град, суправаджаліся бліскавіцамі і моцнымі раскатамі грому. З тэлефонных размоў са знаёмымі я даведаўся, што навальніца пракацілася па ўсёй Брэсцкай вобласці. Як мяняецца наша асяроддзе! Навальніца ў лютым... Назіраў за ёй і адчуваў: чалавек, хоць ён і цар прыроды, але падуладны гэтай самай прыродзе.

**Сцяпан НЕФІДОВІЧ,** *в. Любань, Лунінецкі раён.*

●Як паведамілі сіноптыкі, навальніцы ў лютым здараюцца адзін раз у 25—50 гадоў.

### КАСТРА ЗМЯНІЎ КАСТРА

Нацыянальная асамблея Кубы 24 лютага абрала Рауля Кастра старшынёй Дзяржсавета. Рауль Кастра стаў пераемнікам свайго брата Фідэля Кастра, які кіраваў краінай на працягу 49 гадоў.

### ЗНІКЛА 56 000 ЕЎРА...

56 тысяч еўра і 6 тысяч долараў не далічылася дырэктар аднаго са сталічных таварыстваў з дадатковай адказнасцю: грошы зніклі з кватэры пацярпелай. Паводле звестак аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, 39-гадовая жанчына аб сваёй бядзе паведаміла ў міліцыю, супрацоўнікі якой хутка ўстанавілі, адкуль у такой вялікай сумы ў СКВ «выраслі ногі». Як высветлілася, ў крадзяжы падазраецца прыёмны сын дырэктара, які вучыцца на 2-м курсе ПТВ і раней ужо быў судзімы за крадзеж. Падазроны затрыманы.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### УПАЛА Ў ШАХТУ ЛІФТА

У Віцебску 41—гадовая гараджанка ўпала ў шахту ліфта, што ў доме, які будуюць. Як паведамілі «Звяздзе» ў прэс-цэнтры УУС Віцебскага аблвыканкама, гэта адбылося па неасцярожнасці пацярпелай а пятай гадзіне дня на будаўнічай пляцоўцы ля гандлёвага дома «Вольга» на праспекце Будаўнікоў. Жанчыну з рознымі раненнямі шпіталізавалі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### СПЯШАЛІСЯ І ПАД ЛЁД ЛЕДЗЬ НЕ ТРАПІЛІ

Гэта — пра двух чалавек, якія па сваіх справах накіроўваліся прыцемкамі ў мінулыя выхадныя з Чачэрска ў адну з вёсак так званай засаджэўскай зоны. Таму не паехалі на «жыгулёнку» праз мост Селянін—Палессе, а ўзялі курс на Белы Бераг. Напрасткі. Па лёдзе. А той не вытрымаў, і аўтамабіль апынуўся на дне ракі. Добра яшчэ, што вадзіцель і пасажыр уратаваліся, перанёсшы стрэс. Эмчээсаўцы, як паведаміў нам прэссакратар Гомельскага ўпраўлення МНС Руслан Габрылёў, на наступны дзень вызвалілі «жыгулёнка» з лядовага палону. Дарэчы, у гэтым самым месцы гады чатыры таму пад лёдам апынуўся трактар.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

Тваё правы

## РАБІЎ-РАБІЎ І НІЧОГА НЕ ЗАРАБІЎ...

**Змена працы, як новы год: усе святкуюць і спадзяюцца на новае шчасце. Аднак для многіх яна абарочваецца расчараваннем: рабіў-рабіў і нічога не зарабіў. Кадравае ашуканства дагэтуль не адышло ў нябыт. Нядобрасумленныя наймальнікі і сёння нажываюцца на гора-працаўніках, расстаўляючы няхітрыя пасткі. І юрыдычная неадукаванасць сушукальнікаў — наймальнікам толькі на руку. Каб не ашукацца, варта мець на ўвазе магчымыя ўлоўкі махляроў. Не менш карысна ведаць магчымыя выйсці, калі вас усё ж падманулі. Юрыдычны «лікбез» праводзе Вольга СЫМАН, адвакат Мінскай абласной юрыдычнай кансультацыі № 3.**

**Пастка № 1. А ці была праца?**

Пры ўладкаванні вам растлумачылі ў дэталях, як і што вы павінны зрабіць, сказалі нават, колькі вам за гэта заплацяць і папрасілі прыступіць зараз жа. Вы з імпэтам узяліся за працу, ужо ўяўляючы, як пералічваеце першы заробак. І вось калі нарэшце расклеілі аб'явы/раздалі лістоўкі/загрузілі тавар са складу (варыянтаў насамрэч бясконцае мноства) — зрабілі ўсё, што ад вас патрабавалася, — і прыйшлі па свае «кроўна заробленыя», вам сказалі, што такога працаўніка не значыцца і чым, маўляў, пацвердзіш, што гэта ты рабіў, а не Вася Пупкін.

**Як не трапіць?** Патрабуйце дакументальнага афармлення на працу. Заключыўшы працоўны дагавор ці кантракт, ці дагавор падраду, вы абароніце сябе ад недарэчнасцяў.

**Як выбірацца?** Калі вас усё ж падманулі і не заплацілі, ёсць шанц атрымаць заробленае праз суд. Вядома ж, давядзецца даказаць, што сапраўды выконвалі гэту працу. На жаль, зрабіць гэта вельмі цяжка, а пры некаторых відах працы і наогул немагчыма. Для доказу патрэбны сведкі ці дакументальныя пацверджанні. У практыцы Вольгі Мікалаеўны былі выпадкі, калі даверлівага вадзіцеля «выратаваў» дарожны ліст, а працаўніка экскаватара — падпісаны ім дакумент аб інструктажы. Аднак гэта, хутчэй, выключэнні...

**Пастка № 2. Выпрабавальны тэрмін.**

— Мы бяром вас з выпрабавальным тэрмінам, — кажуць вам пасля гутаркі. — Калі на працягу месяца ваша праца не будзе выклікаць наракання, афармім як мае быць, пакуль жа нічога падпісваць не будзем.

Пакарыстаўшыся вашымі паслугамі месяц, вам кажуць, што вы не прайшлі «выпрабаванне». Далей спрацоўвае пастка № 1. І чым больш такіх «выпрабаванцаў», тым вышэйшыя даходы прадпрыемства.

**Як не трапіць?** Незалежна ад таго, «выпрабоўваюць» вас ці не, з самага першага дня працы неабходна падпісаць дакумент, які афармляе прыём вас на працу, і ў ім вызначыцца з тэрмінамі і памерамі аплаты.

**Як выбірацца?** На вас зноў-такі кладзецца цяжар даказвання таго, што менавіта гэту працу выконвалі менавіта вы.

**Пастка № 3. Абяцалі залатыя горы.**

Вы вырашылі падпрацоўваць вартаўніком, прычым не за 300 тысяч рублёў, якія значацца ў большасці прапаноў, а ажно за 900 тысяч, што прапануе ў газетнай аб'яве «салідная будаўнічая арганізацыя». Вось нарэшце мінуў месяц бяссонных начэй «суткі цераз двое» і вы прыйшлі па разлік, а вам працягваюць акт выкананых прац паводле дагавора падраду, дзе замест абяцаных 900 значацца 300 з хвосцікам. Пачынаюцца высвятленні, маўляў, «Вы абяцалі», аднак абяцанні тыя ніяк не пацверджаны юрыдычна і 900 тысяч прадугледжаны «толькі працоўным дагаворам, які мы з Вамі не заключалі».

**Як не трапіць?** Зноў жа падпісвайце дакумент, які афармляе вашы працоўныя адносіны з наймальнікам і ў якім у абавязковым парадку вызначаюцца памеры аплаты канкрэтнай працы.

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

Грошы

## Долар — падае, золата — «цяжэе»

**Два месяцы таму 10-грамовы мерны злітак золата (попыт на іх цяпер найбольшы) абыходзіўся пакупніку ў 290 долараў ЗША. Зараз уладальнік можа прадаць яго банку ўжо за 309 долараў. За непрацяглы час залаты актыў прынёс чалавеку даход у 19 долараў.**

Куды больш істотны прыбытак маглі атрымаць беларусы, якія раскашэліліся на залатыя зліткі іншай — напрыклад, 100- і 1000-грамовай вагі: у першым выпадку зліткавы метал дазволіў зарабіць 189 долараў, у другім — 2551 долар. Аднак, каб разлічваць на добрыя дывідэнды, неабходна было выкласці і вялікія грошы. 100-грамовы злітак каштаваў у канцы снежня мінулага года 2851 долар, а кілаграмовы — 27790. А вось купля 1-грамовага злітку ніякіх выгод за гэты час не прынесла: прадаваўся ён тады за 35 долараў, купляецца банкам зараз таксама па 35.

Каментуючы звышдаходнасць золата, якая назіраецца ўжо працяглы час (дарэчы, за апошнія сем гадоў сусветная цана ўзрасла амаль у тры разы), эксперты аддаюць даніну, па-першае, адной з асноўных пераваг гэтага металу — здольнасці захоўваць кошт незалежна ад тых катаклізмаў, якія адбываюцца ў свеце. Адпаведна няпэўнасць на фінансавых рынках і падаючы курс долара з'яўляюцца менавіта тымі прычынамі, якія цяпер штурхаюць кошт золата ўверх. Дарэчы, адносна курса долара і кошту золата некаторыя аналітыкі, напрыклад, сцвярджаюць наступнае: людзі бачаць цану золата, якая намінавана ў доларах, аднак пры гэтым трэба разумець, што гэта не столькі золата расце, колькі падае долар.

Раней мы паведамлялі, што з пачатку гэтага года на сусветных рынках цэны на золата пабілі гістарычныя максімумы, наблізіўшыся да 900 долараў за тройскую ўнцыю. Аднак сёння і такі максімум падаецца неўражвальным, калі абапірацца на прагнозы, што пачалі даваць некаторыя аналітыкі. У прыватнасці, у СМІ з'явілася інфармацыя пра тое, што да канца мая цана за ўнцыю золата складзе 1000 долараў, а да канца года дасягне 1200. Верагоднасць падобнага развіцця падзей высокая, аднак, хто гарантуе, што менавіта так і будзе?..

Напрыклад, **начальнік упраўлення інфармацыі Нацыянальнага банка Беларусі Анатоль ДРАЗДОЎ** у гутарцы з карэспандэнтам нашай газеты заўважыў, што прагназаваць можна ўсё, што заўгодна: іншая справа — як усё гэта збываецца? «Пакуль жа — так, золата дэманструе ўстойлівую тэндэнцыю да росту», — адзначыў ён. Улічваючы, што Беларусь — краіна з адкрытай эканомікай, то пакуль кошт золата расце ў свеце — цана на каштоўны метал узнімаецца і ў нашай краіне.

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**

**НАЛІЧНАЯ СЯРЭДНЯЯ ЗАРПЛАТА РАБОТНІКАЎ БЕЛАРУСІ Ў СТУДЗЕНІ СКЛАЛА BR756 ТЫС. 332**

**Аб гэтым паведамілі БЕЛТА ў Міністэрстве статыстыкі і аналізу.**

Налічаная сярэдняя заработная плата рабочых і служачых у студзені гэтага года склала Br778 тыс. 184 (у снежні 2007-га яна была Br818 тыс. 523).

**Логойский сельский исполнительный комитет Логойского района Минской области проводит открытый аукцион по продаже земельных участков для строительства и обслуживания жилого дома**

**лот № 1** земельный участок № 1 площадью 0,25 га, расположен по адресу: д. Михалово, стартовая цена 3 750 000 белорусских рублей;

**лот № 2** земельный участок № 2 площадью 0,1346 га, расположен по адресу: д. Михалово, стартовая цена 2 019 000 белорусских рублей;

**лот № 3** земельный участок площадью 0,15 га, расположен по адресу: д. Нивки, стартовая цена 1 500 000 белорусских рублей.

Размер задатка — 10 % от стартовой цены участка.

Порядок проведения аукциона оговорен в Положении о его проведении.

**Аукцион состоится 25 марта 2008 года в 10.00 по адресу: г. Логойск, ул. Тимчука, 6, кабинет 7.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются до 22 марта 2008 г. до 14.00 по вышеуказанному адресу.

**Телефоны для справок: (8 01774) 55 0 56, 54 3 50.**

УНН 600181577

## ШЛЮБНАЯ ДАМОВА — ШЛЮБУ ПАДМОГА?

**Яшчэ нейкіх дзевяць гадоў таму само спалучэнне слоў «шлюбны дагавор» прыводзіла беларусаў у шок. Тады ў шлюбна-сямейным заканадаўстве літаральна адбылася рэвалюцыя. Лібералізацыя працягваецца і ў новым стагоддзі: са жніўня 2006 года магчымасць аб усім дамовіцца з'явілася і ў тых пар, якія толькі збіраюцца падацца ў ЗАГС, праўда, уступае ў сілу такая дамова толькі са з'яўленнем праславутага штампа ў пашпарце.**

Калі ў 2001 годзе толькі 86 пар заключылі шлюбныя дагаворы ў мінскіх натарыяльных канторах, то ўжо ў 2006-м гэта лічба вырасла да 450. Такой інфармацыяй з намі падзяліліся ў Першай мінскай гарадской дзяржаўнай натарыяльнай канторы, якая, прынамсі, лідзіруе па колькасці заключаных шлюбных дагавораў. Колькі пар «дамовілася» ў Мінску летась, пакуль яшчэ падлічваюць, аднак, хутчэй за ўсё, іх будзе не нашмат больш, чым у 2006-м. Чаму беларусы не спяшаюцца заключаць шлюбныя дамовы? Прычын мноства. Некаторым маладым сем'ям — тым, што жывуць у інтэрнаце або здымаюць кватэру, проста няма чаго дзяліць, а пра астатнія магчымасці Шлюбнага дагавора яны не ведаюць. Многія ж з тых, каму ёсць чым дзяліцца, кіруюцца прынцыпам «не кліч ліха, пакуль ціха» і не дапускаюць нават думкі пра расстанне. На жаль, далёка не ўсе яны пражываюць разам паўвека, большасць жа нечакана для саміх сябе становяцца чужымі і пачынаюць дзяліць вілкі з лыжкамі. Дык чаму б не пралічыць магчымыя «раскладкі» цяпер — пакуль пачуцці не згаслі, і вы можаце размаўляць адно з адным спакойна, без крыкаў «Я аддала яму самыя лепшыя гады» або «Яна мяне запілавала», а пастулаць высакародна.



Карацей, для людзей разважлівых і рацыянальных, Шлюбны дагавор — прадмет першай неабходнасці, ну а разбірацца ва ўсіх яго тонкасцях будзем разам з **загадчыцай Мінскай абласной юрыдычнай кансультацыі № 3 Ірынай ХАДАСЕВІЧ.**

— Дакладнага азначэння паняцця «шлюбны дагавор» у прынцыпе няма, аднак у артыкуле 13 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і ідзе размова аб тым, што Шлюбны дагавор заключаецца ў мэтах умацавання шлюбу і сям'і, павышэння культуры сямейных адносінаў, усведамлення мужам і жонкай сваіх правоў і абавязкаў, а таксама адказнасці адно за аднаго і за дзяцей, — тлумачыць Ірына Іванаўна.

*(Заканчэнне на 3-й стар.)*

## ПАЦЯПЛЕЕ ДА ПЛЮС 11 І ЗНОЎ ПАХАЛАДАЕ

**У першай палове гэтага тыдня мы трапім пад уплыў Атлантычных цыклонаў, якія прынясуць да нас вільготнае і цёплае паветра, паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый Рабаў.**

У першыя тры дні тыдня тэмпература будзе на 8—10 градусаў вышэйшая за норму. Удзень да 27 лютага ўключна яна будзе дасягаць плюс 4—11 градусаў, уначы — 1—7 цяпла. Чакаюцца цёплыя дажджы, уначы слабы туман. У чацвер на працягу сутак будзе ад 0 да 6 цяпла. У пятніцу ўначы ад мінус 4 да 2 цяпла, удзень ад 0 да плюс 6 градусаў. У апошні дзень зімы чакаюцца ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. На выхадныя надвор'е пагоршыцца. У суботу — дождж, а ў нядзелю — дождж і мокры снег. Тэмпература паветра ўначы ў суботу ад мінус 2 да плюс 3 градусаў, удзень плюс 1 — 8; у нядзелю на працягу сутак — ад мінус 2 да 4 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**



**Программа участия ОАО «Белагропромбанк» в развитии агроэкотуризма в Республике Беларусь**

**В рамках реализации Программы ОАО «Белагропромбанк»:**

- оказывает информационную и методологическую поддержку субъектам агроэкотуризма ;
- предоставляет кредиты для реализации проектов субъектов агроэкотуризма.

**Субъекты агроэкотуризма** - физические лица, постоянно проживающие в сельской местности, ведущие личное подсобное хозяйство, и крестьянские (фермерские) хозяйства.*

**Кредиты** предоставляются в белорусских рублях под **5% годовых**:

- крестьянским (фермерским) хозяйствам - **сроком до 5 лет**;
- физическим лицам - **сроком до 7 лет**.

**Сумма кредита:** определяется в соответствии с предоставленным субъектом агроэкотуризма проектом в размере, как правило, не более 90% его стоимости.

**Погашение кредита:**

- основной долг - ежемесячно равными долями или по графику в соответствии с обоснованием источников погашения кредита при реализации проекта (с учетом сезонности оказания услуг субъектом агроэкотуризма). ***Предусмотрена отсрочка погашения основного долга по кредиту на 12 месяцев***;
- проценты - ежемесячно;
- досрочное погашение основного долга без ограничений.

* *Осуществляющие деятельность по оказанию услуг в сфере агроэкотуризма впорядке и на условиях, определенном Указом президента РБ от 02.06.2006г.№327.*

Контакт-Центр Банка:
**136** (по РБ бесплатно)
**8-029-19-85-777** (Velcom)
**8-025-91-85-777** (БеСТ)
**8-029-88-85-777** (МТС)
**8-017-21-85-777**
время работы 8.00 - 20.00 без выходных и праздничных дней

www.belapb.by
белагропромбанк

**(Працяг тэмы на 3-й старонцы.)**

**КУРСЫ ВАЛЮТ**

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 26.02.2008 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 147,00 |
| 1 еўра | 3 181,10 |
| 1 латвійскі лат | 4 567,11 |
| 1 літоўскі літ | 921,32 |
| 1 чэшская крона | 127,11 |
| 1 польскі злоты | 892,83 |
| 1 расійскі рубель | 87,75 |
| 1 украінская грыўня | 425,11 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

**Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 24,4663 |
| 10 UAH | 48,0136 |
| 1000 BYR | 11,3870 |
| EUR | 36,2248 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 25.02.2008 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2135 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

ISSN 1990 - 763X

08037>

**Уважаемые акционеры ОАО «МинскСортСемОвощ»**

**28 МАРТА 2008 ГОДА СОСТОИТСЯ ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «МИНСКСОРТСЕМОВОЩ».**

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2007 год и основных направлениях его развития в 2008 году.
2. Отчет о работе Наблюдательного совета за 2007 год.
3. О заключении Ревизионной комиссии по результатам проверки деятельности Общества за 2007 год.
4. Об утверждении годового отчета, бухгалтерского баланса Общества, распределения чистой прибыли за 2007 год и утверждения направлений распределения чистой прибыли в 2008 году.
5. Избрание членов Наблюдательного совета Общества.
6. Избрание членов Ревизионной комиссии Общества.
7. Об установлении материального вознаграждения членам Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
8. Об оказании спонсорской помощи семенами и др. ресурсами общественным организациям инвалидов, детским приютам в 2007 году и утверждении ее суммы на 2008 год.
9. О наделении Наблюдательного совета Общества полномочиями, отнесенными к компетенции общего собрания акционеров.

**Место проведения собрания: г. Минск, ул. Минина, 21, корп. 1.**
**Начало собрания: 8 часов 30 минут.**

*Время регистрации участников — в день проведения собрания с 8 часов до 8 часов 25 минут по месту проведения собрания.*

**Регистрация акционеров проводится по паспорту, а представителей акционеров — по паспорту и доверенности.**

**Наблюдательный совет ОАО «МинскСортСемОвощ».**

УНН 600052664

белагропромбанк
традиции будущего

**ПОБЕДИТЕЛЬ КОНКУРСА «БРЭНД ГОДА 2007»**

**Открытое акционерное общество «Белагропромбанк»**

**СООБЩАЕТ, ЧТО 7 МАРТА 2008 ГОДА ПРОВОДИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ**

**220036, г. Минск, проспект Жукова, 3.**

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об утверждении дополнений в Устав ОАО «Белагропромбанк».

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, — 25 февраля 2008 года.

Для получения бюллетеней для заочного голосования просим обращаться в ОАО «Белагропромбанк», его филиалы и отделения по месту нахождения акционеров.

Бюллетени для заочного голосования заполняются и представляются не позднее 5 марта 2008 года.

С решениями, принятыми общим собранием акционеров банка, можно будет ознакомиться в учреждениях ОАО «Белагропромбанк» после 17 марта 2008 года.

**Телефоны для справок: 8(017) 250 60 01, 228 53 03.**

Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ от 27.10.2006 г. № 2, УНП 100693551

**ИЗВЕЩЕНИЕ 25.02.2008**
**КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводит аукционные торги по продаже:**

— 3-этажного кирпичного здания (2038 кв.м, пл. зем. уч. 0,3611 га) и здания проходной (10 кв.м, пл. зем. уч. 0,0049 га) в д. Будагово Смолевичского р-на;
— здания склада (463,4 кв.м, железнодорожная ветка) Пуховичский р-н, г.п. Руденск, ул. Железнодорожная, 3. Пл. зем. уч. 0,0723 га;
— здания магазина (105 кв.м, торговый зал — 48,28 кв.м) по адресу: Пуховичский район, д. Заречаны (около 30 км от МКАД) Пуховичское РАЙПО. Пл. зем. уч. 0,0322 га;
— производственной базы (здание гаража об. пл. 292 кв.м, здание склада об. пл.96 кв.м, административное здание об. пл. 156 кв.м) по адресу: г. Узда, ул. К. Маркса, д. 94. Пл. зем. уч. 0,5326 га;
— здания ателье № 5 (155,0 кв.м) по адресу: г. Слуцк, ул. Жукова, д. 21. Пл. зем. уч. 0,0595 га;
— зданий склада № 1 (847,8 кв.м) и склада № 3 (общ. пл. 848,5 кв.м) по адресу: Несвижский р-н, г.п. Городея, ул. Вокзальная, д. 23 А. Пл. зем. уч. 1,0950 га.

**Контактные телефоны (8017) 2246134.**
**Сайт в Интернете: www.rlt.by**

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводит открытый аукцион**

по продаже 3-этажного кирпичного здания (общ. пл. 2038 кв.м, пл. зем. уч. 0,3611 га) и здания проходной (общ. пл. 10 кв.м, пл. зем. уч. 0,0049 га), расположенных: Смолевичский р-н, д. Будагово. Начальная цена снижена на 30 % и составляет 436 800 000 бел. руб с НДС. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 08.12.2007 г. **Аукцион состоится 04.03.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 03.03.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактный телефон (8017) 2246134.**
**Сайт в Интернете: www.rlt.by**

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

